ДУК «ПІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА»
Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы

# ПРАЕКТ
# “ВЯРТАННЕ ДА ВЫТОКАЎ”



Пінск, 2025г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
ДЫРЭКТАР ДУК “ПІНСКАЯ
ГАРАДСКАЯ
ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ
БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА”
___________Д.А. Лагодзіч
“_____” __________20   г.

# “Вяртанне да вытокаў”

Праект па папулярызацыі беларускай нацыянальнай культуры

**Пінск, 2025г.**

**Назва:** Праект па папулярызацыі беларускай нацыянальнай культуры "Вяртанне да вытокаў"

**Кіраўнік:** Д.А. Лагодзіч – дырэктар ДУК "Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

**Аўтар праграмы:** Н.В.Маменка – бібліятэкар аддзела маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы

**Выканаўца:** Пінская гарадская цэнтральная бібліятэка

**Дата пачатку праекта:** 01.01.2025г.

**Дата заканчэння праекта:** 31.12.2026г.

**Тэрмін рэалізацыі праекта:** 2 гады.

**Адрас і кантактны тэлефон:**

225710 г. Пінск,
вул. Горкага,15.
Гарадская цэнтральная бібліятэка
тэл. 64-40-18
e-mail: pinsk-gcb@yandex.by

**Кароткае апісанне праекта**

У сувязі з ростам нацыянальнай самасвядомасці асаблівую актуальнасць набывае далучэнне дзяцей і падлеткаў да нацыянальнай культуры і традыцый свайго народа. Тым больш, кожны чалавек павінен ведаць гісторыю родных мясцін, культурныя традыцыі свайго краю, паколькі зварот да бацькоўскай спадчыны выхоўвае павагу, гонар за зямлю, на якой жывеш. Вывучэнне гістарычнага мінулага дазваляе ўбачыць малюнкі жыцця нашых продкаў – сапраўды каштоўны скарб, які ўмяшчае ў сабе вопыт, традыцыі, жыццёвую мудрасць.

Праект накіраваны на папулярызацыю літаратурна-этнаграфічнай экспазіцыі "Вяртанне да вытокаў", створанай на базе гарадской цэнтральнай бібліятэкі ДУК "Пінская ГЦБС". Праз кнігі і экспанаты этнаграфічнага, гістарычнага і дэкаратыўна-прыкладнога характару можна даведацца пра асноўныя віды рамёстваў, якія былі распаўсюджаны сярод жыхароў беларускіх вёсак на працягу многіх стагоддзяў. Экспазіцыя змяшчае элементы сялянскай хаты: печ, ткацкі станок, прылады працы, мастацкую вышыўку, ручнікі і многія іншыя аўтэнтычныя рэчы – тое, што знаёміць нас з культурай беларусаў. З яе дапамогай можна азнаёміцца з укладам жыцця палешукоў, іх традыцыйнымі рамёствамі, а таксама найбольш значнымі каляндарна і сямейна-абрадавымі святамі: летнімі, восеньскімі і іншымі святамі. Склалася цэлая сістэма свят, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, што замацаваліся ў быце і зрабіліся пэўнымі арыенцірамі пры выкананні сельскагаспадарчых работ і падчас адпачынку ў гадавым коле.

У рамках праекта плануецца правесці серыю масавых мерапрыемстваў, якія абагульняюць пошука-даследчую і асветніцкую дзейнасць супрацоўнікаў бібліятэкі па вывучэнні гісторыі, культуры, прыроды палескага краю і папулярызацыі беларускай літаратуры.

Мерапрыемствы будуць рэалізаваны па наступных напрамках:

- вывучэнне і папулярызацыя беларускай нацыянальнай культуры;

- садзейнічанне адраджэнню цікавасці да абрадаў і традыцый продкаў;

- папулярызацыя беларускай мовы з мэтай прыцягнення ўвагі да нацыянальных твораў і развіцця цікавасці да іх чытання.

**Мэты праекта:**

- адраджэнне цікавасці да беларускай нацыянальнай культуры;
- вывучэнне культуры жыцця палешукоў: іх звычаяў, абрадаў і традыцый.

**Задачы праекта:**

- фарміраванне пачуцця патрыятызму, нацыянальнага гонару і свядомасці будучых пакаленняў;
- развіццё цікавасці да культуры продкаў;
- вывучэнне гісторыі Палескага краю;
- захаванне і папулярызацыя спадчыны Палесся: культурных традыцый, звычаяў, абрадаў;
- пашырэнне інтарэса да вывучэння гісторыі, фальклору малой радзімы,
- натхненне на вывучэнне і асэнсаванне беларускай мовы;
- забеспячэнне інфармацыйнага руху праекта.

**Чакаемыя вынікі:**

- прыцягненне ў бібліятэку новых карыстальнікаў;
- развіццё цікавасці да беларускай нацыянальнай культуры, культуры продкаў;
- абуджэнне пачуцця патрыятызму, гонару і любові да роднага краю;
- павелічэнне інфармацыйных запытаў і рост кнігавыдачы па гэтай тэматыцы, павелічэнне колькасці наведвальнікаў масавых мерапрыемстваў, павышэнне якасці бібліятэчнага абслугоўвання.

**Формы рэалізацыя праекта**

У рамках рэалізацыі праекта будуць праводзіцца: літаратурныя вечарыны, агляды творчасці, фальклорныя пасядзелкі, гутаркі, віктарыны, літаратурна-музычныя кампазіцыі, электронныя прэзентацыі, традыцыйныя і віртуальныя кніжныя выставы.

**План масавых мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі праекта “Вяртанне да вытокаў” на 2025 год**

| № п/п | Назва мерапрыемства | Адказны выканаўца | Тэрмін рэалізацыі |
|---|---|---|---|
| 1. | Пасяджэнне клуба “Благавест” – **студзеньскія вячоркі** “Пад чыстым небам Раства” | Духоўна-асветніцкі цэнтр “Вытокі” | Студзень |
| 2. | **Урок памяці** “Чалавек, улюбёны ў Палессе…” / *да 80-годдзя з дня нараджэння мясцовага краязнаўцы, эколага Аляксея Мікалаевіча Дуброўскага (1945 – 2011)* | Сектар краязнаўства | |
| 3. | **Літаратурна-музычная гасцёўня “Шчырасць”:** літаратурны вечар “Зямля бацькоў дала мне права” *да 90-годдзя з дня нараджэння Р.Барадуліна* | Абанемент | Люты |
| 4. | **Пазнавальны калейдаскоп** “Беларуская мова – мелодыя сэрца” | Сектар краязнаўства | |
| 5. | **Фальклорная гадзіна** “Светлая Пасха” | Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы | Красавік |
| 6. | **Гадзіна патрыятызму** “Адна ў нас калыска – зялёны край, славянская зямля” | Сектар інфармацыйна-бібліяграфічнай работы | Красавік |
| 7. | **Этнаграфічная замалёўка** “На Івана, на Купалу” | Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы | Ліпень |
| 8. | **Тэматычная гутарка** “Роднаю зямлёю ганаруся” | Сектар інфармацыйна-бібліяграфічнай работы | |
| 9. | **Віртуальная экскурсія** *“Цуды* Беларусі” *ў рамках праекта «Студия развития детей Умняша»* | Інфармацыйна-культурны цэнтр “Максімум” | Верасень |
| 10. | **Тыдзень краязнаўства** “Калі хочаш ведаць край, у сектар краязнаўства завітай!” | Сектар краязнаўства | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **11.** | **Свята восеньскага ўраджаю** “Багач” | Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы | Кастрычнік |
| **12.** | **Відеа-падарожжа** “Спазнаем Беларусь разам» | Інфармацыйна-культурны цэнтр “Максімум” | Лістапад |
| **13.** | **Этна-падарожжа** “Зімовыя святы беларусаў” | Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы | Снежань |